**Коммуникативная компетенция: принципы, методы, приемы формирования: сб. науч. ст. / под ред. Л. А. Муриной, Ф. М. Литвинко. - Минск: РИВШ БГУ, 2004. - Вып. 6.**
***В. Ю. Дылеўская***

# УРОК ПАЗАКЛАСНАГА ЧЫТАННЯ НА МАТЭРЫЯЛЕ ТВОРЧАСЦІ СЛАВЯНСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ

Задача ўзаемазвязанага вывучэння твораў па-новаму ставіць праблему пазакласнага чытання. Гэта дазваляе звярнуцца да твораў літаратуры, блізкіх па тэме, ідэйнай накіраванасці. Супастаўляючы, параўноўваючы, мы вучым школьнікаў заўважаць нацыянальна асаблівае ў вобразах, мове, а таксама ў агульнай накіраванасці твораў. Урок пазакласнага чытання "Вызваленчы рух у лёсах пісьменнікаў-славян" можа быць асабліва паказальным у гэтым плане. Форма правядзення ўрока – вусны часопіс – выбрана невыпадкова: уключэнне вялікага аб'ёму матэрыялу ў звычайны ўрок небяспечна павярхоўнасцю выкладу. Творчасць Т. Шаўчэнкі, А. Міцкевіча, Я. Купалы таксама ўключана мэтанакіравана, каб паглыбіць веды вучняў пры параўнальным аналізе творчасці **трох** аўтараў.

Для аналізу прапанаваны верш Т. Шаўчэнкі "Калі б вы ведалі, панове" і паэма "Гайдамакі".

Творчасць Я. Купалы вучням ужо знаёма, паэму "Тарасова доля" яны вывучалі ў 9 класе (праграма 1996 г.); паэма прысвечана асобным старонкам біяграфіі Т. Шаўчэнкі.

З творчасцю А. Міцкевіча вучні таксама знаёмы, таму ўрок можа паглыбіць веды. Ад вучняў патрабуюцца ўменні працаваць з навукова-папулярнай літаратурай пры падрыхтоўцы да ўрока.

Вусны часопіс будуецца па наступным плане:

1 старонка. Сэрцы, адкрытыя людзям.
2 старонка. Цікавасць да нацыянальных культур.
3 старонка. Паэма Т. Шаўчэнкі "Гайдамакі".
4 старонка. Я. Купала: "Тарасова доля", "Урывак з паэмы".
5 старонка. Паэмы А. Міцкевіча "Гражына", "Конрад Валенрод".

Кожную старонку рыхтуе пэўная група вучняў, падрабязна прадумваючы змест, спосаб падачы матэрыялу.

У матэрыяле першай "старонкі" вучні адзначаюць падабенства ў лёсах пісьменнікаў, рыхтуюць аб кожным з іх паведамленне. Важна давесці думку, што кантакты славянскіх літаратур не былі аднабаковымі. Аналізуючы выбраныя творы, трэба памятаць аб значнасці кожнага з іх. Задача настаўніка на такім уроку заключаецца ў тым, каб дапамагчы вучням успрымаць творы як мастацкую з'яву, паказаць асаблівасць творчай манеры кожнага пісьменніка, стылёвае багацце і пры гэтым развіваць уменне супастаўляць, параўноўваць па падабенстве ці адрозненні.

Спынімся на 3-й старонцы, якая пабудавана па плане:

1. Гісторыя напісання паэмы Т. Шаўчэнкі "Гайдамакі".
2. Яе гістарычная аснова.
3. Тэма. Кампазіцыя.
4. "Гайдамакі" у ацэнцы сучаснікаў.

Раскрываючы змест гэтай старонкі, вучні адзначаюць фальклорную аснову твора, цікавасць украінскага паэта да гайдамаччыны, г. зн. звяртаюць увагу на знаёмства Т. Шаўчэнкі з такімі творамі, як "История Малой России" Д. Бантыш-Каменскага, "История Русив" невядомага аўтара, "История королевства польского" і інш. А даты, напісаныя загадзя на дошцы (*1648–1654, 1686, 1764, 1768*), напомняць вучням аб вызваленні Украіны ад панскай Польшчы (1648–1654); аб "вечным міры" паміж Расіяй і Польшчай (1686), вынікам якога было ўстанаўленне канчатковай граніцы паміж Расійскай дзяржавай і Каралеўствам Польскім: левабярэжная Украіна і Кіеў адыходзілі да Расіі, а ўся Правабярэжная Украіна – у склад Рэчы Паспалітай. 1764 г. – ліквідацыя гетманства на тэрыторыі левабярэжнай Украіны, 1768 г. – паўстанне сялян, якое ўвайшло ў гісторыю як "Гайдамаччына" (што значыць "гнаная, пераследуемая"). Гайдамаччына была адказам украінскага народа на нечалавечыя зверствы канфедэратаў.

Характарызуючы вобразы паэмы, тэматыку твора, вучні адзначаюць глыбокі патрыятызм Т. Шаўчэнкі. Пры ўсёй сваёй палымянай любові да ўкраінскага народа, ён ніколі не выступаў супраць іншых, наадварот, глыбока паважаў братнія народы, шчыра імкнуўся да дружбы і адзінства.

Акцэнтуем ўвагу на тым, што любоў Шаўчэнкі да роднай зямлі – гэта патрыятызм, які аб'ядноўвае прыгнечаныя народы для сумеснай барацьбы.

Пасля абагульняючага слова вучні "перагортваюць" наступную старонку часопіса, якая расказвае аб даўняй цікавасці Я. Купалы да братняга ўкраінскага народа, яго гісторыі, культуры, літаратуры, і, у прыватнасці, да творчасці Т. Шаўчэнкі. Сваё асэнсаванне творчасці ўкраінскага паэта, яго ролі і месца ў жыцці і барацьбе ўкраінскага народа беларускі паэт выказаў у паэме "Тарасова доля".

Пры разглядзе паэмы адзначым наступныя моманты:

1. Каму прысвечана паэма?
2. Што расказвае нам аўтар аб Кабзары?
3. Як супастаўляе сваё жыццё з жыццём украінскага паэта?
4. У чым агульнасць лёсу?
5. Што парадніла слова ўкраінскага паэта з думамі беларускага народа?

Пры аналізе выкарыстоўваецца краязнаўчы матэрыял. Гэта можа быць паведамленне вучня на тэму "Т. Шаўчэнка і Беларусь", у якім адзначаецца цікавасць Шаўчэнкі да Беларусі, а таксама і цікавасць беларусаў да слова Шаўчэнкі. Кансультуючы па гэтай тэме, завастраем увагу на тым, што цікавасць Шаўчэнкі да беларусаў не выпадковая. Паэт праязджаў некалькі разоў праз Беларусь (1829, 1843, 1847 гг.). Асаблівае ўражанне аказала на яго падарожжа восенню 1829 г., калі ён быў прыгонным пана Энгельгардта. Беларусь уразіла Шаўчэнку голадам і беднасцю. Мажліва, таму ён і запомніў

надоўга гэта падарожжа. Беларусь паэт назаве "краінай жалю і смутку", а ў творы "Музыкант" раскажа аб братнім народзе. На ўроку гэты невялікі па аб'ёму твор аналізуецца. Пытанні могуць быць такімі:

1. Якое ўражанне аказала аповесць?
2. Што гаворыць аўтар аб жыцці братняга беларускага народа?
3. Чаму твор так названы?

Т. Шаўчэнка цікавіўся беларускімі песнямі і нават пад іх уздзеяннем напісаў некаторыя вершы. Ён меў намер з'ездзіць на Случчыну да свайго сябра, беларускага мастака В. Залескага, з якім пазнаёміўся ў ссылцы. Зварот да такога факта біяграфіі ўкраінскага паэта дазволіць сфарміраваць правільныя чытацкія ўменні. Дарэчы будзе паведамленне вучня "Т. Шаўчэнка і беларускі фальклор". Прапануем план:

1. Уплыў паэзіі Шаўчэнкі на беларускі фальклор.
2. Знаёмства з беларускай песеннай творчасцю.
3. Шаўчэнка і беларускі фальклярыст Ян Чачот (верш "Ой дубравы – цёмны гай").
4. Т. Шаўчэнка і А. Міцкевіч.
5. Папулярнасць творчасці Т. Шаўчэнкі ў Беларусі.

Прыкладнае выступленне па апошняй "старонцы" часопіса:

"Муза Міцкевіча натхнялася вызваленчымі ідэямі, для выяўлення якіх паэт выкарыстоўваў умоўна-рамантычную сімволіку. Ён выступаў натхнёным абаронцам волі і шчасця народаў, сам быў удзельнікам нацыянальна-вызваленчага руху. З 1824 г. знаходзіўся ў ссылцы. Гэты тэзіс падмацоўваецца паведамленнем вучня.

У 1848 г., калі хваля рэвалюцый ахапіла Францыю і Італію, Адам Міцкевіч стварыў у Італіі Польскі легіён, які ўліўся ў армію Гарыбальдзі. Кіруючы легіёнам з Францыі, паэт выдаваў у Парыжы штодзённую палітычную газету "Трыбуна народаў". Еўрапейскія рэвалюцыі 1848–1849 гг. былі задушаныя, але А. Міцкевіч верыў, што "трыумф зла не канчатковы".

У 1854 г. пачалася руска-турэцкая вайна, і польскія эмігранты вырашылі стварыць у Турцыі сваё вайсковае фарміраванне, якое ваявала б супраць Расійскай імперыі. Адам Міцкевіч хацеў, каб Польскі легіён дзейнічаў самастойна, што выклікала незадавальненне князя Чартарыйскага (ініцыятара стварэння Польскага легіёна). У разгар справы паэт нечакана, 26 лістапада 1855 г., памёр у Канстанцінопалі (паводле афіцыйнай версіі – ад халеры, але існуе меркаванне, што яго атруцілі прыхільнікі Чартарыйскага). Цела Адама Міцкевіча перавезлі ў Францыю і пахавалі на парыжскіх могілках у Манмарансі. 4 ліпеня 1890 г. астанкі паэта былі перазахаваныя ў Кракаве (у нішы каралеўскага палаца Вавель, побач з А.-Т. Касцюшкам).

Адам Міцкевіч заўсёды марыў аб прызнанні сваёй творчасці. Ён пісаў:

О, мне дажыць бы да гэтай уцехі,
Каб мае трапілі кнігі пад стрэхі,
Каб за кудзеляй сялянкі, прысеўшы,
Песні любімыя даўнія спеўшы

Пра сіраціну-красуню, якая
Вечарам гнала птушыную стаю,
І пра дзяўчыну, што скрыпку любіла
Ды за ігрою свой статак згубіла, –
Каб і мае ўзялі кнігі сялянкі,
Простыя кнігі, як іх калыханкі".

Разгляд паэмы "Конрад Валенрод" адбываецца па наступным абагульненым плане:

1. Якую мінуўшчыну ўваскрасіў А. Міцкевіч? 2. Якія гістарычныя крыніцы выкарыстоўваў? 3. Хто такі Конрад Валенрод? 4. Маральная драма Конрада. 5. Забарона твора на Беларусі. 6. "Вайдэлота" – адзін з псеўданімаў Я. Купалы. 7. Якая агульная ідэя яднала двух геніяў? 8. Пераасэнсаванне Купалам вобраза міцкевічаўскага песняра-прарока Конрада (паэма "Дзяды"). 9. "Урывак з паэмы" Я. Купалы – повязь з рамантычнай традыцыяй А. Міцкевіча. 10. Як паэты вызначылі мэты і задачы паэзіі ў агульнанародным змаганні?